БА179725бр

Ба 179725 бр

ГАЛУБОК.

# АПАВЕДАНЬНЯ.

Wilnia 16/VI-14г.

ПЕЦЯРБУРГ.
1913.

Бел. выдзел 1934 г.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

# Зьмест.


| | Стр. |
|---|---|
| 1. Вада памагла | 3 |
| 2. У сваты | 6 |
| 3. Чужое смачней | 10 |
| 4. На кермашы | 12 |
| 5. Вясковые астраномы | 15 |
| 6. На вясельле | 18 |
| 7. «Журавинка» | 20 |
| 8. Як Сымонъ у волосьці выкруціўся | 22 |


Друк. А. Э. Коллінса (б. Эрліха) М. Дваранск. 19.

# Вада памагла.

«Ну дык пойдзім, мая рыбачка, да варажбіткі у Вуглы», казала маці сваей дачцэ: «хіба-ж толькі табе ні паможэ, а то ўсе, як у бубін б,юць, што раду ўсім дае. А ці-ж ты горш за людзей?»

— «Пойдзім, калі гэдак», атказала дачка, «толькі я нічога казаць ей ня буду, а кажы сабе ты,—ты старая, а старой, што с плеч, то ў печ».

Так пагаварыўшы і парадзіўшыся, маці з дачкой выправіліся ў дарогу. Пляліся, небарачкі, па Барысаўскаму шляху, ат самага раньня, і толькі позна вечэрам трапілі яны да варажбіткі. Ня сьмела атчыніўшы дзьверы, піраступілі яны высокі парог. Варажбітка якраз была ў хаці і стаяла каля печы з вялізнымі вілкамі ў руках.

«Аткуль, кабеткі?» спытала яна падарожных.

— «Здалёку, панюхна, здалёку! Зьнібыткаваліся сусім, раду ўсё шукаім, сьвет прайшлі...» і ў старой, як боб, пасыпаліся сьлёзы. «Летась яшчэ аддала дачку замуж за Гваздка», пачала старая, «скончыўся год, пачаўся другі, а дзетак німа і німа, а яна сохне, небарачка, як красачка без вады. Глянуць, маладзіца хоць куды, чырвонінькая, як брусьнічанька, сама жадае прыплоду, а тут хоць запалі; каму-ж тады мець, калі ня ей?».

Памаўчаўшы трохі, старая гаварыла далей. «Яна мне даўно жаліцца, што яе мужыка быццам ураклі. Можа й праўда. Ці мала на сьвеці ёсьць благіх людзей. Дык памажы-ж, панюхна, калі ласка!»

Маладзіца, пры гэтай гутарцэ старой, схавала свой маленькі нос у зякрастую хустку і парушылася на тапчане.

— «Можа ураклі, а можа і не», сказала варажбітка; «мо так якая набрыдзь убілася, трэба падлячыць, пэўне адойдзе; тагды будзіш мець, баба, ўнукаў».

— «А панюхна! а родная! можа ведаіце раду, памажыце, дужа хочыцца хоць перад сьмерцьцю зірнуць на сваю кроў». Маці, седзючы на лаве, плакала і выцірала рукавом сьлёзы, а дачка, патупіўшы вочы, як вінавайца, сядзела ціханька каля маці, зрэдка уздыхаючы.

— «Пакінь плакаць, бабка!» сказала варажбітка, «вось толькі згатую вячэру свайму мужыку, а там будзім ведаць, ці урокі, ці так якая набрыдзь убілася», ды ізноў пачала поркаць вілкамі у печы, скоса паглядаючы на палаці, дзе лежаў яе мужык, уставіўшы вочы на маладзіцу.

— «Чаго ты вочы паказеліў? каб цябе сьпека пекла!» крыкнула на яго варажбітка. «Вось зараз гарачымі вілкамі лупачы табе павысмаліваю! Бачыш ты яго —ўтаропіўся, каб ты затануў, стары ламака. Здаецца увесь порах высыпаўся, а як згледзіў маладзіцу, аж трасца яго трасе».

«Пойдзім у другую палавіну», зьвярнулася яна да баб.

Зьняўшы с прымурку карты, варажбітка скартавала іх і пачала раскладаць. Падумаўшы троху, іна сказала, што мужыка уракл і, і помач аг уроку можэць даць толькі тутэйшы селянін Кірыла, удавец.

Пазвалі Кірылу.

Праз паўгадзіны скрыпнулі дзьверы і ў хату уваліўся Кірыла, высокага росту, плячысты, не стары яшчэ мужчына, з багатымі на дзіва вусамі.

— «Во і ратунак тут! Прасі, кабетка, яго палячыць. Я с прыкананьня кажу, што будзе ўсё, чаго жадаіце».

— «А дзядзічка! а каласок! а збаўца, памажы!» кінулася старая да лекара: «хоць бы адно дзіцянё; я-ж маці, свайго дзіцяці шкода, марнуіцца, бедная, сьвету не бачыць....»

Кірыла зірнуўшы на маладзіцу, пакруціў чорные як смоль вусы і пачаў тоўстым басам:

— «Памагчы-то можна, але, як я бачу, бязплодзьдзе дужа далёка засела у дачкі», сказаўшы гэта, папрасіў падаць конаўку вады.

Падалі.

Кірыла ушчаміў у магучых руках конаўку і стаўшы у кутку, нешта плявузгаў, плявузгаў і нарэшці даў маладой, каб сама па троху піла і мужыка калі-ні-калі трактавала. Кірыла пры гэтым с прывычкі сказаў, што лекарства гэта хваробу як гужам адойме, а здароўе як мехам прыпрэ.

Старая тым часам, дастаўшы с торбачкі бутэльку картаплянкі, паставіла яе на стол.

Кірыла, як зглядзіў гэткі трактамэнт, зда-

ецца з радасьці больш вырас, і вочы яго заблішчэлі, як у ваўка.

Селі за стол. Перш Кірыла выпіў з маладзіцай, потым са старой і па чарцэ з гаспадарамі, каторые зьбіраліся на спачынак. Страпежылі бутэльку. Кірыла—як тут меў—паставіў другую, і пашла гулянка.

Невядома, ці доўга цягнулася-б яна, каб не патухла лямпа. Ці яно само сабою так зрабілася, ці таго вымагалі лекі, не нам прастым людзям пра тое знаць. Адно толькі можна сказаць, што не дарэмна хадзілі да варажбіткі.

Счэкаўшы паўгода, да знахаркі зноў прышла старая. Цяпер яна была с падарункамі і у яе твары сьвяцілася радасьць.

«А панюхна мая, родная мая, дзякуй жа табе, дзякуй,—усё добра. Дзякаваць Богу, дачка пры надзеі; вось табе за варажбу абрусок, панюхна, а доктару, каб ён здароў быў, за фатыгу, палатна на кашулі,» —гаварыла старая, дастаючы падарункі.

---

## У сваты.

— Чаго ты так рана успароўся, ўнучак?—спытаўся дзед Мешалка свайго ўнука, лежучы на печы,—яшчэ ніхто і ўставаць ня думаў, а ён ужо снуе то ўзад то ўперад; ідзі ляж, пакуль сьвет.—

Але Буфацаму ні спалася; з лямпачкай у руках ён усё хадзіў па хаці і поркаўся то ў куфры, то ў шафі,

— Буфацы!—адазваўся дзед,—падай ты мне

піпку. Нешта і мне ня сьпіцца: млосна зрабілася сьверб па скуры, аж вочы на лоб лезуць.—

Буфацы рад быў гэтым разам дагадзіць дзеду, каторы сягоньня меўся ехаць з ім за свата, дык напхнуўшы піпку поўна тытуном падаў яе дзеду.

Дзед, узяўшы піпку, запыкаў яе, лежучы на печы і пушчаючы дым пад столь.

— Глядзі, дзетка,—адазваўся ўзноў дзед,—добра паднядзелься, каб дзяўчынка ўпадабала, а тады, з ласкі Боскай, у мясаедзі можа і вясельля справім.—

Буфацы, слухаючы гэта, так задумаўся, што выпусьціў неяк з рук вечка ад вяліанага куфра, а яно зненацку як грукане сярод ночы, аж хата затраслася.

Татка Буфацага, сплючы на палацях, так перапалохаўся, што зваліўся на зямлю і ледзь галавы не разьбіў.

— Чаго ты рыесься тут?—накінуўся ён не сваім голасам на сына.—Чаго цябе нячыстая носіць па начы, каб цябе кінула ды не паднялоl Трэба-ж гэдак спужаць, да памяці ніяк не дайду.—

— Ідзі да Тарэсы, ніхай перапалохі твае змые,—агрызься сын, выцягіваючы с куфра камашы, што пашыў калісь-та нябошчык Сымон, габляванку, бравэрку, і пачаў прыбірацца.

Ні цярпелася яму,—першы раз у сваім жыцьці зьбіраўся у сваты.

— Во што значыць маладая кроўl—гаварыў сам с сабой Мешалка. Ноч ня сьпіць, кідаецца, як той жарабок піразімак. Праўда, некалісь і я быў ня лепшы, а цяпер што? ляжы вот на печы, ды плюй у чэрап.—

— Гэ! наш інтэрас старэцкі!—адазваўся бацька Буфацага.—Нам вось косьці усе ныюць. Напрацуісься за дзень, глядзіш, каб дзе у куток зашыцца, а ён от, ноч ня сьпіць, усё думаіць якбы лепі у сваты прыбрацца. Я, як быў у яго веку, то ні разу і барады не галіў, а ён, глядзі, ужо мохры гэтые абцірабіў і сядзіць, як тая варона загуменная.—

— Праўда,—адазваўся Мешалка,—цікава навіт было глядзець, як ён скрабаў сваю бараду, ужо так стараўся, што аж ногі хадуром хадзілі,—І дзед пры гэтым стукнуў піпкай аб комін, вытрасаючы аттуль попіл, ды пацёр рукавом зрэбнай кашулі пасінеўшы, як сліўка, нос.

— Ведаіш, браце!—ізноў сказаў Мешалка,—мусіць мы сягоньня добра хлабысьнём, бо мой нос аж цокаецца сьвярблючы, нібы кароста на яго узьбілася, пэўне прачувае, што выпіўка будзе.—

— А пэўне будзе,—атказаў гаспадар,—мы-ж Лісуна добра знаім: чэлавек ён і багаты і гасьцінны, будзе усяго столькі, што да хаты ні захочэцца варочацца.—

Тым часам надыйшла і раніца, пачало днець. Гаспадыня ужо тупала каля печы, гатовіла сьнеданьне, а мужчыны ладзіліся ў дарогу.

Буфацы першы раз усклаў габляванку з вялізным каўняром і, задзёршы галаву, як прауда, круціў шыяй, як вол у ярме, бо яму з непрывычкі здавалася, што каўнер бэзьміласэрна рэжэць яму на шыі скуру.

Скора тады жарэбок шпарка панёсься па мёрзлай дарозе і, як вокам глянуць, мінаў вёскі.

Ехалі гадзіны са дзьве і ў рэшці на узгорачку

убачылі засьценак. Тут жыў Лісун. Праехаўшы пярэплаць, сваты ўехалі у двор, дзе ім на спатканьне вышоў сам гаспадар і павёў гасьцей у хату.

Малады ня сьмела піраступіў парог і сеў недалёка ад дзьвярэй на тапчане с самага краю, трымаючы шапку ў руках. Вайшлі і дзед Мешалка і бацька маладога. Пачалася гаворка, пытаньня, як жонка, дзеткі, ці ўрадзіла сёліта збожжа, а тым часам дзяўчынка, прыбраўшыся па сьвяточнаму, увайшла у хату.

Буфацы украдкам пазіраў на дзяўчыну, як кот на сала, і пакручываў пальцамі тоя мейсца, на каторым павінны быць вусы, а сват Мешалка усё паглядаў на дзьверы, чэкаючы выпіўкі і закускі.

— Ну, дачушка, — адазваўся гаспадар, — трактуй гасьцей, бо яны спадарожыліся пакуль прыехалі!—

Пашла маладая у сьвіран і ў момэнт на стале зьявілася гарэлка, хлеб, грыбкі залівные, рэзаные сало, і паміж усяго пекны у масьлі засмажэны певінь.

Госьці, як згледзілі такі трактамэнт, аж сьлюнькі папусьцілі, а сват Мешалка зразу пакінуў гамонку пра маладых, а пірайшоў да гарэлкі, хвалючы яе, што яна і кроў грэе і ўселякіе нямоцы лечыць.

Гаспадар, узяўшы вялізны нож, ушчаміў пеўня ў таўстых пальцах і толькі хацеў краянуць, а певінь як сьлізьне с талеркі на стол, ды чуць чуць не апынуўся пад сталом.

— О, злодзі! ляцець хочэ!—жартаваў сват.

— Не паляціць,—атказаў гаспадар і, ушчаміўшы зноў пеўня меж пальцаў, пакраіў яго на талерцэ.

Гасьцей многа упрашываць не прышлося, ведама з дарогі, дык не ўважаючы елі так, што аж насы іх гнуліся.

— Дачушка!—зьвярнуўся да дачкі гаспадар:— пячы нам яешню, а я вось скокну гарэлкі ды сала яшчэ прынясу.—

Але неспадзеванае здарэньне сапсавала дальш увесь інтэрэс. Толькі стары вышоў с хаты па сала ды гарэлку, дзяўчына палезла па яйкі у падпечак. Туды яна залезла спрытна, але як прышлося вылазіць назад, тагды толькі, бедная, сьцяміла, што бяз сораму вылезьці нельга, бо падпечак, як на грэх, быў цесны, павярнуцца ў ім трудна, дык прыхадзілася вылазіць адным толькі спосабам, на которы іна ніяк не магла пры гасьцях адважыцца.

Меж гасьцьмі зрабілася замешаньне.

Адзін толькі сват, дзед Мешалка, не страціў прытомнасьці. Зірнуўшы, як вылазіла маладая, ён сказаў:

— Ну, дзеткі, глядзіце: месяц усходзіць, едзьмо да дому!—І пакуль гаспадар вярнуўся ды агледзіўся, гасьцей і сьлед прастыў.

---

## Чужое смачней.

У вёсцы Неманец жыў стары Ігнат, аўдавелы гадоў з дзесятак таму назад.

Дзед быў с характэрам старасьвецкіх людзей.

Яго даўгая, сівая барада, чырвоны, прыветны твар мелі шмат павагі, і кожнаму, хто раз убачыў дзеда,—у вачах малявалася пекная хвігура старога. Гаспадарку меў ня дужа вялікую, але, працуючы ад раньняга да цёмнага хлеба меў аж надта.

Трэба было толькі трапіць к Ігнату, а галодзен ня будзіш; накорміць, напоіць, а падарожнаму і с сабою дасьць.

Памятую, як сягоньня: зайшоў я раз сьвятым днём к дзеду пагаманіць. Дзед палуднаваў. Зараз туды сюды сабраў, якіе меў, прысмакі, усадзіў мяне на кут і трактуе. Слова за слова, разгаманіліся пра гаспадарку. Вось дзед і кажэ: – Усё, дзякаваць Богу, урадзіла: і зерняткі ёсь, і агуркі ёсь, а бульба, браце, як вырасьце, жаднага смаку ні мае, хоць вон выкінь. Вазьмі вось, спрабуй! –

Закаштаваўшы колькі бульбін, хоць можа і грэх, але я памысліў, што Ігнат ад старасьці смак згубіў. Але, ня хочучы дзеда гумар псуваць, згадзіўся з їм і кажу:—праўда, бацька, праўда: смаку німа, гэта ўжо ня бульба, калі ядлоўцам аддае. Вось трэба, каб маей закаштаваў, то пэўне і на насеньне узяў-бы!—І далёка не адкладаючы, прашу дзеда к сабе, а сам пры гэтым мысьлю, трэба старому выкінуць шутку і накарміць яго яго-ж уласнай бульбай.

Як раз перад тым, калі дзед меўся быць, я папрасіў у яго жонкі сьвежа накапанай бульбы, абчысьціў яе, і зварыў.

Прысунуўся дзед. Селі за стол. Зварэную бульбу з гарачым парам, у вялізнай місцы, са скваркамі уставілі перад намі на стол. Чарку

дзед—чарку я—і ну, за бульбу. Дзед яшчэ і ня пробаваў, а ужо кажэ:

— Зразу чуваць, што бульба не раўня маей, глянуць, душа радуецца, а здаецца земля адна, праца тая самая, а хвальш такі ёсь.—

І не пасьпелі добра агледзіцца, як бульбы ані званьня не асталося ў місцы.

Як толькі сабраўся дзед адыходзіць і начаў дзякаваць за частунак, я і кажу:

— Не варта, дзядзька, за сваё добрае дзякаваць, гэта каб еў маю бульбу, ну, то тады ўжо так, а як хватыгаваўся над сваей, толькі ў маей хаці, то не варта.—

Дзед з дзіву вылупіў вочы.

І як я не тлумачыў, ён усёж-ткі веры не даваў. Але нарэшце, атходзючы дамоў, паківаў галавой і засьміяўся, кажучы:—Праўда, суседзе, чужое заўсягды здаецца смачней за сваё.—

## На кермашы.

На шырокім шляху, каля хаты сядзельца, і справа, і злева гусьцінька стаялі падводы, прыехаўшые на кермаш.

Як машына чэкае званка, так усе гаспадары, вышоўшы посьлі абедні с цэрквы, чэкалі той хвілі, калі пан сядзелец атчыне дзьверы і задаволіць їхняе жаданьне прагнаць сьмягу.

Але, як на ліха, дзьверы не краталіся, а сьмяга горш і горш данімала ўсіх.

— Што за ліха?—пыталіся адзін у другога селяне,—час прайшоў, а дзьверы замкнуты. Захварэў ён, ці што?—

Маруднасьць сядзельца грызла ўсіх, а больш маркоціўся шчыры прыхільнік бутэлькі, Міхась Чорнагуз.

Седзючы на возе нідалёчка ля дзьвярэй, ён з ніспакою дзесяты ўжо раз пірасьлібізаваў вывеску, піралічыў колькі было літэр на ей, і нарэшце пачаў лічыць дошкі у футраных дзьверах.

Толькі справіўся піралічыць у ваднэй палавіне і перайшоў да другой, аж бач яна са скрыпам адчынілася і апоўзлая хфігура сядзельца паказалася ў дзверах.

Як апарэны сарваўся з возу Міхась і пабег у манапольку, а за ім як авечкі і другіе. Дзьверы не зачыняліся. Адзін вылазіў, а на яго мейсцэ дзесяць старалася ўлезьці і сядзелец, хістаючыся з боку на бок, ледзьве упраўляўся піраймаць трудавыя капеечкі, выдаючы за їх уселякіх гатункаў бутэлькі.

Усе стараліся—і сядзелец і селяне. Было відаць, як кожны вылазіў з дзьвярэй упацеўшым, моцна сьціскаў у руках шклянного шчупака і з давольным відам адыходзіў к возу. Тут ён аткурковываў бутэльку, стукаючы даланёй у дно, і папіваў з яе, задзёршы галаву.

Ажыўленьне расло. Селяне, пазьбіраўшыся гурткамі ля вазоў, віталіся, жычылі адзін аднаму лепшых варункаў у жыцьці, абнімаліся, а дзе дык і ваdзіліся. Недалёчка ад усяго гэтага сядзелі двое убогіх. Затаіўшы у сэрцы жуду, цярпліва сядзелі яны пад дуплявай бярозай і сьпевалі Лазара, падцінаючы на лірэ.

Але пабожнае настраеньне ад їх скора уцякло, як прыблізіліся да їх вясёлые, добра лыкнуўшые, малайцы.

Шкода їм стала калек. Вось адзін з їх вывалак на волю бутэльку, што коса паглєдала з кішані у неба, і ну трактаваць лірнікаў.

Сьціхла песьня; замоўкла ліра. Конаўка пераходзіла то з рук сляпога ў рукі храмога, то на адварот, аж пакуль у ей асушылося дно.

— Ну, братцы! — адазваўся Паўлюсь,—цяпер рэжце лявоніху, хто з вас майстар. Каліж пагуляць, як ні сягоньня? —

Сьляпы хоць і добра дзюбнуў, але доўга не здаваўся на просьбы хлапцоў, а посьле махнуў рукой, бардзей закруціў корбу, залапатаў клявішамі і вясёлая Лявоніха заступіла мейсцэ Лазара. Дзяцюкі не дрэмалі і пусьціліся скакаць, падхапіўшы с сабой храмога старца, што стаяў без работы у старане.

Той ні спрэчаўся. Трымаючыся за плячо Міхася, ён як конь круціў пакрыўленым задам і прытопываў шырокім, як заслонка, лапцем. Відаць было, што ён стараўся з усіх сіл. Яму хацелася так сама даказаць, што і ён нешта ўмее, асабліва тады, як выпье.

— Калісь я ня гэткія танцы ўваліваў на гульбішчах,—хваліўся ён, абціраючы выступіўшы на лбе пот.

Сьляпы, лупаючы патухшымі вачыма, бардзей завіхаўся круціць корбу, атбіваючы тахт нагой і радуючыся ў сэрцы, што хоць на астатку жыцьця, а трапілася гульнуць з добрымі людзьмі, што не пачураліся їх, бяздольных калек.

---

# Вясковые астраномы.

Доктар з астраномам наважыліся раз на дзень-два пакінуць горад і сьцерці час у вёсцы.

Ведама, чаго шукалі, тоя знайшлі—дзьве гадзіны дарогі, і вёска Халадцы, як вырасла перад імі.

Ідучы вуліцай меж старых хат, яны бачылі, як агледалі іх праз вокны цікавыя бабы, і як маленькіе мурзатые дзеткі, шэпчучыся адзін з адным, перабегалі праз вуліцу—і прыгледаліся ім у вочы.

Як там што не было, але паном усё падабалося, бо яны гэта блізка што ў першыну бачылі. Доктар, выгадаваўшыся у багатых бацькоў, праўда чуў пра гора мужыкоў, але, не пазнаёміўшыся з іх жыцьцём бліжэй, мала ведаў аб іх. Гэдак сама і астраном. Давучыўшыся да сівых валасоў, а посьле вылічаючы як і калі будзе зацьменьне, дзе якіе плянэты і т. п., ня меў часу зірнуць у вёску і, каб ня шчыры яго прыяцель доктар, пэўне, што адзін не паткнуўся-б туды.

Вось нашы вучоные, агледзіўшы з большыны лес, поле, вярнуліся ізноў у вёску і зайшліся да селяніна Гапцуля папалуднаваць.

Доўга не прышлося чэкаць: гаспадынька заварушылася, затрэшчалі на прыпечку трэсачкі, і смачная яешня ў момэнт апынулася на стале.

Тыц-мыц, з верху троху паны пазьбіралі дый пакінулі. Яшчэ астраном, туды сюды, а доктар, як відаць, і рад-бы зьесьці, але баяўся, каб не зашкодзіла.

Тым часам у хату увайшоў сам гаспадар. Скінуўшы с сябе армяк і адгладзіўшы бараду, ён сеў за стол, адваліў лусту хлеба, ушчаміў яе у таўстых пальцах, ды пачаў есьці, сёрбаючы пастаўленую жонкай на стол капусту. Доктар паказеліўшы вочы гдядзеў і дзівіўся, як Гапцуль спаражняў адну місу капусты, другую, ды і за трэцьцюю ўзяўся.

Тут доктар пачаў шэптацца з астраномам, шырока разводзючы рукамі. А Гапцуль тым часам, толькі пачуўшы самы смак, спаражняў яшчэ і чацьвёртую місу крупніку.

«Гатоў аб заклад ісьці», марматаў свайму прыяцелю доктар, што гэты чэлавек аб'еўся і не далей, як сягоньня у ноччы Богу душу аддасьць, ня вытрымае.

І вось, як будзе то будзе, а доктар задумаў астацца ў гаспадара і чэкаць бяды, каб у часе памагчы чэлавеку.

Гапцуль, на астатку глынуўшы мерку квасу, адгладзіў бараду і, як паважна садзіўся, так паважна устаў ды, не раўнуючы, як пан прысеў на ложку і адваліўся на падушкі.

Не агледзіліся, як надыйшоў вечэр. Гапцуль, унёсшы свежага сена, прымасьціў гасьцям пасьцель і кажэ: «Спаць то добра будзе, але на раніцы мухі пытлююць трохі».

Але астраном на тое атказывае:—«Добра то добра, німа што казаць, але мы лепі ў садку высьпімся,—бачыш, які прыгожы вечэр».

«Ну як сабе знаеце, па мойму дождж павінен быць». Астраном усьмехнуўся, падмігнуў доктару і з ім паважна пасунуўся ў садок пад яб-

лыньку. У самай поўначы ні атсюль, ні аттуль узьняўся вецер, ды калі ўрэзаў дождж, калі шматанула маланка, дык нашы начлежнікі, як маг: кінуліся ў хату і з радасьцю паляглі на прыгатаваным з вечэра мейсцу.

Астраном ані як ня мог дадумацца, як мог пазнаць просты мужык, што будзе дождж, калі ён, вучоны, і то не пазнаў гэтага.

Толькі настаў дзень, доктар зірк, ці жыў селянін. А той сьпіць сабе, задзёршы галаву, як ўпадла, падхропываючы на ўсе лады, як у жалейку.

Вось толькі прачнуўся Гапцуль, доктар і пытаіцца: «Скажы, браце, як выдыхаў ты ўчэрайшую ежу? Няўжо нічога?

«А, не, гэта звычай, паночку: ем датуль, пакуль брухам стол не адсуну, а як ужо стол кранецца, тады годзе».

«А скажы — перапыніў астраном, — аткуль ты ведаў, што дождж будзе ў ночы».

«Ёсць у мяне рабенькі бычок, і калі толькі ён пачне хвост лупіць, то так і спадзевайся дажджу. На тым тыдні так сама у вечары быў дождж, то мой бычок яшчэ зраньня пачаў хвост лупіць».

«Слаўны бычок, слаўны» — цадзіў скрозь зубы астраном: «прадай ты мнѣ яго! Добра было-б, калі часамі маё вока не спраўдзіць, то бык да толку давеў бы...»

---

# На вясельле.

(Апаведаньне старога дзеда).

Было мне гадоў шэснаццаць. Помню як сягоньня, часьценька у сьвята мы траляваліся ў Барысаў на кірмаш — бывала, сам я адзін — бывала, с сястрой Пятрўнэляй, а яна тады была дзяўчынай.

У Барысаве заўсягды спатыкалі мы дзядзьку нашага, а то часьцей цётку; вось яны, абы толькі сустрэўся, зараз пачынаюць пытацца, што чутно і ці скора Пятрунэлю замуж аддаваць будзем. Мне гэтае пытаньне так абрыдла, так далося ў косьці, што стаў я мяркаваць, як адвучыць іх ад яго.

Здарылася неяк, я загуляў у Барысаві с хлопцамі; пакуль тоя ды сёя, дык і цёмна стала, а тут яшчэ, як на безгалоўе, дошч лупянуў такі, што як з лубу ліе. Хацеў перш ісьці да дому, але аднаму неяк было боязна, дый далёка,—вёрст восем па дажджы цёпкацца, дай, думаю, пайду да дзядзькоў і папрашу іх на вясельле. Пэўне пойдуць!

Падхаджу да хаты і ляпаю ў вакно. Яны ўжо спалі. Чую крэкчучы лезе дзядзька с печы:

— «Хто там?»—пытае.—«Я!»—

— «Чамуж гэдак позна?» — «А вось татка і мамка на ўсё прасілі, каб вы на Пятрунэліно вясельле канешне прышлі.»—«Ці ты здурэў?— ізноў кажэ дзядзька, — па начы і ў гэткую пагоду?»

А я давай лгаць, што пакуль па дарозе

зайшоў да аднаго, да другога, то хоць і вышаў с хаты да сьвету, але да дзядзькі крыху спазьніўся.

Дзядзька верыў і ня верыў, але, як чалавек гасьцінны, усёж такі зьвярнуўся да цёткі і кажэ: «Пайдзём ці што?» — «Хіба пойдзім» атказала тая. — «Ну, дык зьбірайся!»

Зачалі варушыцца. Дзядзька с сьвірна прынёс булку хлеба, закінуў за плечы, захапіў люльку ў зубы, а цётка падкасалася ў дарогу, і павалакліся па дажджы, ды па балоці.

Я ішоў шляхам памеж бярозак, — ад сьмеху чуць не валяўся.

Ішлі мы гадзіны са дзьве. Змоклі да ніткі. Вось падышлі і пад нашу вёску.

Цёмна, хоць пальцам у вока пары. Сабакі выюць. Вось наша хата. Я адыйшоўся і паглядаю, што гэта будзе.

— «Што за хвароба?» — бурчыць дзядзька, — «чаму гэта у хаці цёмна? Ці яны ўжо па вясельлі, што спаць паклаліся?» — А цётка, як мыла зьеўшы: «Можа і паклаліся, ведама маладые, дык пасьпяшыліся трохі».

— «Ну годзе гаманіць! стукай, бо я чуць жывы!»

Толькі цётка пачала барабаніць — атклікаюцца с хаты: «Хто там?» — «Мы!» — «Хто мы?» — «Ды-ж мы, на вясельле прышлі» — «Якое вясельле, хто вас клікаў, ці не Сымонка, каб ён прапаў?» — «Але-ж ён!» — «Зманіў, каб ён затануў! Скарэй у хату ідзіце!»

А дождж ліе як з лубу.

Я пайшоў сабе ў еўню і выспаўся добра



Б а / 179725

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя У. І. Леніна

да раньня. С таго часу ні цётка, ні дзядзька ніколі больш не пыталіся, калі вясельле Пятрунэлі.

---

## «Журавінка».

Аж дзіваваліся людзі, як жаніўся наш Рыгор: сам вялізарны, сутулаваты, як крук, а маладзіцу браў маленькую, чырвоненькую, бытцам журавінку. Вясельле згулялі, як сьлед,— ну і жылі сперша нішто.

Толькі ў скорасьці наш доўгі Рыгор са сваім сутулам стаў неяк цянець і гнуцца на перад,—с крука зрабіўся, як вуда, і с твары пачаў чарнець, а жонка «Журавінка» круглець... Бачыць яна, што мужык хірлее і слабее, дай і сама хвост аткінуць:—стала крэктаць і жаліцца на нейкую хваробу. Па сабе Рыгор не бедаваў, але за жонку спалохаўся, так ужо моцна ухляпаўся ў яе. Кінуўся туды-сюды: курыцу, пеўнем што пяе, дастаў; пашаптух і блізкіх, і далёкіх запрасіў; уселякае зельле гатавалі, палілі, курылі; качалкі праз вакно кідалі—і чаго не рабілі—не памагала. «Журавінка»—журавінкай: як на балоце узросшы, разбохалася, але паправы німа.

Ажно надарыўся нейкі стары знахар; Рыгор бух яму ў ногі: так і так, кажэ—ратуй маю «журавінку»,—апошні хвост *) прадам!

Знахар палядзеў, памацаў хворую, галавой паківаў: кепска, кажэ, «*марматун*» у ей; рада

---

*) Скаціціну.

адна: лёду насушыць, ветру наскрабаць, камарынага сала назьбіраць і спарыць у бярэсьцяным гаршку, потым мазаць перад агнём грудзі і паясніцу хворай; хвароба пэўне адойдзе, а здароўе верніцца.

Зажурыўся Рыгор, бо не патрапіў гэткую прыправу зрабіць: аж тут жонка і каже: «Не маркоцься, мой ты аздабулечка, сама я лепш ведаю што мне трэба: пяску з мора прыцягні, як рукой усё зьніме».

Паскрабаў мужык патыліцу, паскрабаў, але папёр такі с торбай да мора. Цягнуўся небарака да поўдня, зьнібыткаваўся, прысеў атпачыць крыху, стаў смактаць люльку,—ажно тут надыходзіць даўнейшы яго сусед—Язэп, што пайшоў летась у прымы у другую вёску. Суседзі разгутарыліся,—Язэп і кажэ: «Паслухай ты мяне, Рыгорка, варочайся да хаты, і я с табой пайду і дам рады тваей бабі».

Пайшлі.

Позна вечэрам прывалакліся пад хату. Бачаць агонь у хаці бліщчыць. Рыгор — зірк у вакно,—ды аж выпрастаўся, як слуп: на стале яешня са скваркамі, бліны, верэшчака, як вір, і брыкалаўка у пляшцы, а побач яго «Журавінкі» сядзіць хлапец— Янка Канцавы...

Скрыгатнуў Рыгор зубамі, заціснуў кулакі, а тут Язэп і шепчэ: «Маўчы, ды лезь у мех, а я пайду прасіцца на ноч».

Ледзь упхнуў Язэп свайго таварыша ў мех, завязаў, успёр на плечы і пасунуўся ў хату прасіцца, каб пусьцілі перэначэваць.

Сперша гулякі ані блізка, але, нешта пашэп-

таўшыся, згодзіліся. Язэп убіўся ў кут і пачаў мех разьвязываць, тым часам тые за сталом пьюць і ядуць, а «Журавінка» яшчэ і завела: «Нема майго Рыгора, пайшоў па пясок да мора», а Янка, падхапіўшыся ў бокі, падцінае: «тунда, тунда, тундада!» А Язэп с кута і кажэ: ня вытрываю—запяю і я: «А мой жэ ты Рыгору, вылазь з меха на волю, вісіць бізун на сьцяне, дай ты Янку і жане: Янку раз, жонцы два, тунда, тунда, тундада!!...»

Мусіць хочэце ведаць, што было далей?—Вось, не скажу! хіба толькі тое, што наша «вудá» цяпер стала прасьцей хадзіць, а гладкая скурачка «Журавінкі» пачала моршчыцца...

---

# Як Сымон у воласьці выкруціўся.

*(Апаведаньне старога дзеда).*

Як толькі мне хто успомніць пра нябошчыка Мікіпара, што жыў у нашай вёсцы, то шкода, крый Божэ якая,—забыцца ня можна: кару, небарака, цяжкую нёс, бо ад каберца не пашчасьлівілася жонкай, а посьле дзеткамі...

Што разумен быў, спорні німа, але і заўзяты; к таму любіў часам і за сябе пастаяць,—трэба толькі закалыпнуць яго, то ўжо той не рад будзе; пакажэ ён, па чым сотня грэбянёў!

Нябошчык Мікіпар, працуючы, як вол, цэлы тыдзень, толькі ў нядзелю плечы разгінаў, а каб

гэты дзень меў адліччэ ад другіх—заходзіў к Ёселю лыкнуць картаплянкі.

Вось тады ніхто не паткніся пярэчыць яму.

Хоць і даўно, праўда, было гэта, калі нашага брата скура ды з дзеркачом знаёмасьць вадзіла, але тые часы як у вачах стаяць—забыцца нельга, як сягоньня помню.

Як Мікіпароў сынок убуяў ужо, то крый Божэ, што вытвараў з бацькам,—што дзень лаянка, бойка; ходзючы на жальбу у воласьць парогі пабівалі... Ідуць, ды ідуць: то сын, то бацька,—ці то так ужо за звычай мелі, ці затым, што воласьць не далёка была.

Прыйшоў неяк я к Мікіпару за віламі, аж чую, што сын з бацькам ужо гутараць па троху. «Ты цяпер разумен за бацькавым каркам!—галёкаў дзед,—с хаты гоніш, ды і дзьверы зачыняеш, каб табе мяліца зачынілася! Нічагутка праўды дакапаюся; табе язык уйму, ня будзеш старому напрыкрацца: ня дуж я, але найдуцца ў воласьці такіе, каторые здужаюць асілка, як мае быць улюіць і навучаць, як старых шанаваць!»

— «Мне улюіць?—пытаўся зьдзіўлены сын—за цябе, старога ражна, ды мне будуць скуру дзерці? Ня можэ быць!»

— «Будуць, ці ня будуць, а пажывём—убачым!»—казаў дзед.

І так, слова, за слова, зайшлі далёка.

Можэ на тым бы і скончылася, аж трэба, як на бяду, зіркастая курыца, узляцеўшы на пераплот, запеяла ва ўсё горла пеўнем, дый палящела ў суседні гарод.

Стары, нічога не кажучы, як апарэны, кінуўся

с сякерай за курыцай, злавіў яе ды шась сякерай па галаве.

Сын, азьвярэўшы, к бацьку:

— «Ты на што курку зарубаў?!»

— «Як-жэ, яна пеўнем запеяла,—прах яе забяры?».

Але сын не ўтрымаўся: штаўхануў старога ў грудзі, ледзьве стары на нагах устаяў.

— «Ты мяне біць?»—усхапіўся дзед, ды так абухам у плечы! Сын бацьку поўху; бацька сыну ізноў абухам у плечы... Пазьбіваліся да крыві. Каб не ўмешаліся суседзі, нет ведама, чым бы гэта бойка скончылася.

Бацька, паклаўшы сякеру, гайда ў валасьць, а сын за бацькам.

Нявестка, убачыўшы, што стары далёка ўжо адыйшоўся, паклікала Сымонку свайго і кажэ:

— «На табе трохі грошы, там можа каму падаткнеш, каб старому рэбрыны палічылі, а сам кіруйся, каб як выкруціцца».

Нет ведама, як там з імі у валасьці абыйшліся, але доўгі час абодвых небыло; нявестка, бачучы, што іх усё яшчэ німа, зацікавілася і пабегла даведацца.

Толькі пачала мінаць Петуховы гароды, аж бачыць: бяжыць Сымон, трымаючыся за паясьніцу, зьбялеўшы, як палатно.

— «Ну як жэ? ці выкруціўся? — спыталася жонка.

— «Я ўжо выкруціўся а стары яшчэ выкручываецца!»—прамарматаў скрозь сьлёзы Сымон...

---



Дзяржаўная бібліятэка Б.С.С.Р. імя У. І. Леніна

B000000 144 1682